# «І жывыя і памерлыя пішуць гісторыю свайго месца. . .»: стары Койданаўскі некропаль



**Андрэй Бараноўскі,**
галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі


Стары Койданаўскі некропаль. Жнівень, 2023 г.

Да гэтага часу некропалі былога мястэчка Койданава (з 1932 г.– горад Дзяржынск, цэнтр Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці) не былі прадметам спецыяльнага даследавання. Калісьці тут дзейнічалі 10 могілак шасці канфесій.

Зараз існуюць наступныя: старыя; новыя, ці Дзягільнянскія (па назве суседняй вёскі Дзягільна); месца масавага расстрэлу яўрэяў; Брацкія могілкі палеглых вайскоўцаў і партызан; Макаўчыцкія (па назве былой вёскі Макаўчыцы, уключанай у межы горада); асобныя пахаванні святароў пры Свята-Пакроўскай царкве [1].

## Стары Койданаўскі некропаль

Яго афіцыйная назва: Грамадзянскія могілкі, Старыя могілкі па 2-й Ленінскай вул. Дзяржынска; мясцовая назва: Старыя гарадскія могілкі, Старыя Дзяржынскія (Койданаўскія) могілкі; архіўная назва: могілкі Публічныя парафіяльныя Койданаўскія. Па тыпу канфесійнай прыналежнасці: змешаныя. Статус: закрытыя 22.10.2014 г. рашэннем Дзяржынскага райвыканкама [9].

Старыя могілкі – адзіныя закрытыя (практычна з 1960 г.; да 1972 г. праводзіліся падхаванні да магіл сваякоў), гэта адзіны гістарычны некропаль, які захаваўся да нашага часу. Пры правядзенні даследавання ўлічваліся палявыя матэрыялы [1], даныя вуснай гісторыі, архіўныя [4–8], друкаваныя і іншыя крыніцы. Крайнія даты даследавання: 2011–2015 гг.; маніторынг стану: 2011–2023 гг.


Пахаванне (склеп) сям'і Шацукевіч



Пахаванне Георгія Мезена (1797–1902), старажыла мястэчка


Пахаванне доктара Іосіфа Абламовіча (1804–1866)

Некропаль знаходзіцца ў заходняй частцы горада, займае плошчу 1,4 га. Раней раздзяляўся цэнтральнай алеяй шырынёй 4 м, якая ішла ад варот з поўдня на поўнач, на дзве паловы: направа – рыма-каталіцкая частка, налева – праваслаўная.

Паводле архіўных дакументаў, могілкі былі адкрыты ў 1795 г. на падставе ўказа імператрыцы Кацярыны Вялікай у 1792 г. аб пераносе ўсіх пахаванняў за межы гарадоў і мястэчак. Раней нябожчыкаў-хрысціян хавалі на цвінтарах пры касцёле, кальвінскім зборы і царкве. З 1800 г. у цэнтральнай частцы стаяла драўляная праваслаўна-каталіцкая Свята-Георгіеўская царква, прыпісаная да Свята-Пакроўскага храма, які існаваў у Койданаве з XVI ст. [4].

Тут пахаваны прадстаўнікі розных канфесій – рыма-каталікі, уніяты, праваслаўныя, некалькі евангелістаў, іудзеі, мусульмане і атэісты (захаваўся адзіны помнік з выявай пяцікановай зоркі). Найстарэйшае знойдзенае надмагілле дваранак Францішкі Антаневіч (дата смерці – 1845) і Катажыны Крупскай (1847) – гранітны пастамент-помнік з польскай інскрыпцыяй, апошняе – металічны крыж Пелагеі Мікалаеўне Жукоўскай (1969) з надпісам па-руску.

Сярод нябожчыкаў ёсць прадстаўнікі шляхты, дваран, мяшчан, служыцеляў культу, чыноўніцтва, інтэлігенцыі, ваенных, паліцэйскіх, сялян, рамеснікаў, рабочых, служачых, жабракі. Сярод іх – падданыя Расійскай імперыі, Аўстра-Венгрыі, грамадзяне Савецкага Саюза, па нацыянальнасці беларусы, рускія, украінцы, палякі, літоўцы, латышы, татары, яўрэі, аўстрыйцы, немцы.

Па нашых падліках, усяго пахавана больш за 5200 чалавек. Алфавітны індэкс пахаваных, магілы якіх існуюць дагэтуль, складае 792 прозвішчы. Цікавы прыклад: колькасць выяўленых памерлых на падставе палявых даследаванняў за 1945 г. – 8 чалавек; па даных архіва загса Мінскай вобласці ў гэтым годзе памерлі 74 чалавекі – 66 пахаванняў страчаны. У межах тэмы пазначым колькасць жыхароў Койданава: 1866 г. – 1,4 тыс., 1897 г. – 4,7 тыс., 1917 г. – 4,9 тыс., 1926 г. – 5,5 тыс., 1939 г. – 8,7 тыс., 1970 г. – 11,5 тыс.

Выбарачны, за 1835–1850 гг., аналіз дынамікі смерцяў паказвае найбольш вялікія (61 чалавек у 1845 г.) і малыя (25 чалавек у 1849 г.) страты насельніцтва, а таксама тры эпідэміі халеры – у 1831, 1848 і 1855 гг., раней невядомыя; асноўныя групы прычынаў смерцяў: 1) па старасці (лічыцца з 59 гадоў); 2) хваробы – сухоты, адзёр, коклюш, «опухі», пухліны, воспа, гарачка, канвульсіі, венерычныя хваробы, дызентэрыя, дыярэя; 3) нечаканыя смерці, «воляй Божай».

## Інскрыпцыі

Храналагічны ахоп інскрыпцый – 1830–1972 гг. 14 эпітафій указваюць на прафесіі, пасады, званні, рангі нябожчыкаў: дэпутат Мінскага павета, ксёндз – пробашч касцёла, доктар медыцыны, земскі фельчар, жонка жандарма, настаўніца, дыякан, тры вайскоўцы – палкоўнік, падпалкоўнік Рускай Імператарскай арміі, гвардзеец – малодшы сяржант Савецкай арміі.



Пахаванне падпалкоўніка РІА Кірыла Папраўкі (1861-1909)



Пахаванне сыноў Баляса, Эдвардэка і Казе арганіста Койданаўскага касцела Івана Неўяроўскага



Пахаванне сям'і Дзям'яна (Дамініка) и Аршулі Курашэўскіх

Большасць ранейшых помнікаў – рыма-каталіцкія, з надпісамі па-польску, звыш 10 інскрыпцый характэрызуюцца фрагментарнай прысутнасцю лацінскай мовы, адзін надпіс на беларускай мове (1936, Пётр Рыгоравіч Драздоўскі) і адзін арабскай вяззю (?, Канарскі). Руска-польскія інскрыпцыі і эпітафіі, аднолькавыя прозвішчы, напісаныя па-руску і па-польску,– яскравыя прыклады прысутнасці сярод адной сям'і ці роду прадстаўнікоў розных канфесій: Бабраўніцкія, Бакіноўскія, Груша, Курашэўскія, Лагуновічы, Мазуркевічы, Нупрыкі, Рудаміна, Сабалеўскія, Сняжко, Шацукевічы, Шот і інш.

Самыя распаўсюджаныя прозвішчы (сямейна-родавыя пахаванні каталікоў і праваслаўных; выбарка ад 7 носьбітаў і болей): Мялешкі (20); Лагуновічы (19); Шот (18); Бакіноўскія (12), Кулікоўскія (12), Тарнагурскія (12), Шацукевічы (12); Мазуркевічы (11); Бабраўніцкія (10), Жылінскія (10); Заблоцкія (9), Пахамовічы (9), Шаблоўскія (9); Жукоўскія (8), Каткоўскія (8), Пракаповічы (8), Тагановічы (8); Будай (7), Качарскія (7), Маркевічы (7), Нупрык (7), Папраўка (7), Руда(о)міна (7), Снежка (Сняжко) (7).

Самыя распаўсюджаныя імёны: мужчынскія – Аляксандр, Вікенцій, Іван; жаночыя – Марыя, Ганна, Аляксандра.



Самае старое пахаванне. Помнік Францішке Антаневіч (1766-1845) і Катажыне Крупскай (1799-1847)



Татарскі камень



Прыклад анкеты сваяка пахаванага. І.А. Дашко

Падвоеныя імёны, якія сустрэліся аднойчы: мужчынскія – Балеслаў Альгерт, Вікенцій Лаўрэнцій, Іван Сямён; жаночыя – Бася Міра, Калета Марыя, Магдалена Ганна.

Рэдкія, якія сустрэліся аднойчы (акрамя Зебіяшчавічаў) імёны па бацьку: Вітальевіч, Гіляравіч, Даніілаўна, Зебіяшчавіч, Іларыёнавіч, Ільінава, Іпалітаўна, Карлавіч, Клімяньцьеўна, Майсеевіч, Мордухавіч, Нічыпаравіч, Парфёнавіч, Расціслававіч, Селівестравіч, Сільвестрыеў, Фаміч (Фамінічна), Фомавіч, Цэліцыянаўна, Ягораўна, Яўменаўна.

Узроставы дыяпазон памерлых ад аднаго дня (напрыклад, неданошаны, 1853, Іаан Сайкоўскі) да 105 (1902, Георгій Мезен) і 109 (1904, Васілій Калоднік) гадоў.

На некалькіх праваслаўных помніках у ніжняй частцы пастаментаў з граніту выяўлена сігнатура «*Койдановъ Куликовскій*». Так, у населеным пункце існавала майстэрня рытуальных паслуг Антона Сямёнавіча Кулікоўскага (1868–1935), мясцовага скульптара і гравёра, які таксама апошні прытулак знайшоў тут [1].

## Страчаныя пахаванні (выбарка)

Сабраны матэрыял на падставе архіўных звестак, даных вуснай гісторыі і апублікаваных крыніц аб пахаваннях, якія не захаваліся да нашага часу. На яго аснове складзены спіс, які ўтрымлівае кароткія біяграфічныя звесткі пра найбольш знатных нябожчыкаў.

**АНДРАНОЎСКІ (ЧАХОВІЧ-АНДРАНОЎСКІ) Адам** (1784–1852), рыма-каталік, дваранін герба Сыракомля, зямянін Берасцейскага ваяводства, паводле радавога падання паходзіў з Чэхіі, камісар маёнтка Станькава Мінскага павета (1828), дэпутат Мінскага павета; жонка Тэкля (Канапацкая), дачка.

**ВЯРЫГА Вікенцій Нікадзімавіч** (1826–1860), праваслаўны святар, памёр ад сухотаў.

**ЗАБЛОЦКІ Алімпій Вітальевіч** (?–?), сын старшыні мяшчанскай управы м. Койданава, маці з роду Вараксаў, якія рабілі ў Радзівілаў; ляснічы, уласнік 5 дамоў, 2 фабрык.

**ЗАЎСЦІНСКІ Міхаіл Фларыянавіч** (1785–1846), святар Койданаўскай прыхадской Пакроўскай царквы, памёр з гарачкі.

**КАВАЛЕЎСКІ Ігнацы** (1800–1843), рыма-каталік, дваранін, доктар медыцыны, памёр у Павуссі ад чорнай меланхоліі.

**КАМАРОЎСКІ Казімір** (1753–1798), рыма-каталік, дваранін, гласны сейма Літвы.

**МАХАЕЎ Пётр Мікалаевіч** (1855–1915), нар. у г. Глазаве Вяцкай губ., праваслаўны, дваранін, сын афіцэра; скончыў 2-е ваеннае Канстанцінаўскае вучылішча; удзельнік Руска-турэцкай (1877–1878), Руска-японскай (1904–1905), Першай сусветнай (1914–1915) войнаў; генерал-маёр Рускай Імператарскай арміі (1913); памёр ад халеры.

**ПАПРАЎКА Іван** (18??–18??), праваслаўны, заможны мясцовы жыхар, уладальнік зямлі і лясных угоддзяў: сады, агароды, лясы цягнуліся па левым боку сучаснай вул. Амельянюка да чыгункі, мясцовасць у 1930-я гг. захоўвала назву «Лужок Папраўкі»; 1-я жонка Марыя Адольфаўна (Быкоўская), 2-я жонка Катажына Папраўка (1820–1892), сыны: Кірыл, Іван, Ігнацій.

**ПЯЧКО Ева** (18??–?), нар. у м. Койданава, бабка Шмеі (Мальчэўскай) Ганны Юльянаўны (1925–?), ураджэнкі м. Койданава, жонкі Шмеі Івана Сцяпанавіча (1922–1998), Поўнага кавалера ордэна Славы (пахаваны на Дзягільнянскіх могілках).

**СКРЫЦКІ Фелікс Казіміравіч** (1827–1901), рыма-каталік, дваранін, калежскі саветнік (на 1881), доктар, павятовы ўрач Калужскага павета, член Таварыства калужскіх дактароў (1865–1887); ахвяравальнік Койданаўскага парафіяльнага касцёла; памёр ад астмы.

**СУПРАНОВІЧ Вінсэнт** (1784–1837), рыма-каталік, арганіст Койданаўскага парафіяльнага касцёла, памёр ад сухотаў; жонка Эльжбэта, сын Ян.

**ТОЛКАЧ Феліцыян** (1787–1841), дваранін, асэсар Ігуменскага пав. Мінскай губ.; жонка Марыя, сын Антоній, дачка Каміла.

## Каталог пахаванняў (выбарка)

Каталог пахаванняў – адзін з галоўных вынікаў нашых даследаванняў. Ніжэй прадстаўлены выявы электронных картак, якія ўтрымліваюць апісанні пахаванняў, што захаваліся да нашага часу (усяго ў каталогу 792 карткі). Біяграфіі нябожчыкаў складзены з дапамогай архіўных звестак, даных вуснай гісторыі і апублікаваных крыніц. Кожная інскрыпцыя змяшчае аўтэнтычны надпіс, радкі падзяляюцца касой рысай. Від аб’екта, матэрыял і памеры помніка, апісанне і стан аб’екта прыведзены на падставе палявых даследаванняў.

**Біяграфія:** Абламовічы гербу Габданк (Абданк); сын слонімскага ваяводы Карла Абламовіча і Анны (Есьмант); мешчанін, доктар медыцыны Віленскага ўніверсітэта (1828); працаваў лекарам у Мінскай губ.; уладальнік маёнткаў Мікулічы, Негарэлае, фальварка Зуі ў Мінскай губ., 4 паштовых станцый і паштовага дому ў Клецку; памёр у сваім маёнтку Негарэлае Мінскага пав.; жонка Людвіка Узлоўска; дочкі Жазэфіна, Марыя, сын (?) Юзаф.

**S. P. / JOZEF SYN KAROLA / ABLAMOWICZ / OBYWATEL ZIEMSKI / DOKTOR MEDYCYNY. / URODZIL SIE / D: 1 STYCZNIA 1804 R. / UMARL / D: 10 KWIETNIA 1866 R.**

**Апісанне і стан аб’екта:** мармур, пяшчанік, жалеза, свінец, чыгун; 200x70x40 см; стэла з паліраванага светла-шэрага мармуру, прывезенага з Грэцыі ці Урала, на светла-шэрым мармуровым і двухскладовым каменным (пяшчанік з паўднёва-заходняй часткі Польшчы), апрацаваным прамавугольным пастаменце, адбітыя верхні светла-шэры мармуровы чатырохканцовы і фасадны металічны (герб роду?; страчаны) крыжы, надпіс выкананы ў вялікай узорнай нішы, тэхніка ўрэзкі надпісу мастацкая па выкананні, чыгунная агароджа (страчана), надмагілле, верагодна, выраблена ў майстэрні Варшавы; тэхнічны стан аб’екта нездавальняючы; рэстаўрацыя помніка выканана ў лістападзе 2014 г.

**Біяграфія:** нар. у 1821 г., з дваран г. Арла, праваслаўны, выхаванец Наўгародскага графа Аракчэева кадэцкага корпуса; палкоўнік Рускай Імператарскай арміі, удзельнік Крымскай вайны (1853–1856), падаўлення польскага паўстання (1863–1864); жонка Наталья Міронава, дачка інжынер-капітана; сын Уладзімір (1850–?).

**Полковникъ / Николай / Николаевичъ / ЗОММЕРЪ / + 20 Іюл. 1896 г. / Господи упокой / его душу.**

**Апісанне і стан аб’екта:** граніт; 195x50x25 см; стэла з паліраванага шэрага граніту на двухскладовым паліраваным шэрым гранітным прамавугольным пастаменце, адбіты крыж зверху, тэхніка ўрэзкі надпісу мастацкая па выкананні, перад датай смерці выява чатырохканцовага крыжа, на фасаднай частцы пастамента разьбяны арнамент, агароджа жалезная каваная; тэхнічны стан аб’екта нездавальняючы.

**Біяграфія:** скончыў курс Імператарскага Маскоўскага ўніверсітэта са званнем лекара, земскі ўрач Койданаўскага ўчастка, штатны ўрач Койданаўскага вышэйшага пачатковага вучылішча; сын Аляксандр (1889–1956).

**† / Никольский / Александр / Николаевич / 1857–1936 /**

**Никольский / Александр / Александрович / 1889–1956**

**Апісанне і стан аб’екта:** бетон, жалеза; 160x70x18 см; стэла з бетону на бетонным прамавугольным пастаменце, тэхніка ўрэзкі надпісу мастацкая па выкананні, у левым верхнім кутку выява шасціканцовага крыжа, літары падведзены залатой фарбай, жалезная агароджа; тэхнічны стан здавальняючы.

**Біяграфія:** нар. у м. Койданава, дзед Шмеі (Мальчэўскай) Ганны Юльянаўны (1925–?), ураджэнкі м. Койданава, жонкі Шмеі Івана Сцяпанавіча (1922–1998), Поўнага Кавалера ордэна Славы.

**З. † П. / ДИМИТРІЙ / ПЕЧКО / УМ. 14 СЕН. 1895 Г. / НА 28 Г. ЖИЗНИ / МИЛОСЕРДІЯ ДВЕРИ / ОТВЕРЗИ МИ / БОГОРОДИЦѢ / ПАМЯТЬ ...**

**Апісанне і стан аб’екта:** граніт; 75x45x30 см; абеліск з паліраванага шэрага граніту, тэхніка ўрэзкі надпісу мастацкая па выкананні, уверсе выява шасціканцовага крыжа, разьбяны раслінна-кветкавы арнамент; тэхнічны стан аб’екта нездавальняючы, агароджа адсутнічае.

**Біяграфія:** нар. у 1861 г. у м. Койданава ў сям'і заможных мясцовых жыхароў, праваслаўны; скончыў Горы-Горацкія каморніцка-таксатарскія класы; Рыжскае пяхотнае юнкерскае вучылішча; падпалкоўнік Рускай Імператарскай арміі.

**З.П. / Прахъ / Подполковника / Кирилла / Ивановича / Поправко / Ум. на 48 г. жизни / 11 ноября 1909 г. / Друзья / и братья / молітѣсь / о упокое / ніи ду - / ши его.**

**Апісанне і стан аб'екта:** граніт, чыгун, жалеза, сталь; 260x50x35 см; надмагілле ў выглядзе кроны дрэва са зрэзанымі галінамі з шэрага граніту, з шэрым гранітным чатырохканцовым крыжам зверху ў выглядзе кроны дрэва са зрэзанымі галінамі, чатыры шыльды – адна ў выглядзе скрутка (самая вялікая), іншыя, ніжэй, у выглядзе раскрытай кнігі (абедзве фасадныя) і дзве тыльныя ў нішах; тэхнічны стан аб'екта нездавальняючы, агароджа жалезная каваная.

**Біяграфія:** фельчар Дзяржынскай раённай бальніцы; антыфашыст-падпольшчык у гады вайны, закатаваны ў турме; бацька Паўла Мікіціча Хмялеўскага (Харытона), арганізатара і кіраўніка мясцовага падпольнага руху, камісара партызанскага атрада, пасля вайны загадчыка аддзела Дзяржынскага РК КП(б)Б, работніка апарата Савета Міністраў БССР, ганаровага грамадзяніна Дзяржынска.

**З. † П. / ХМЕЛЕВСКИЙ / Никита / Никифорович / род. 1885 г. / ум. 15 Окт. 1942 г. / Пам. жены и детей. / Мир праху твоему**

**Апісанне і стан аб'екта:** мармур, жалеза; 150x60x25 см; абеліск з паліраванага чорнага мармуру на паліраваным чорным мармуровым прамавугольным пастаменце, тэхніка ўрэзкі надпісу мастацкая па выкананні, уверсе выява шасціканцовага крыжа, літары падведзены залатой фарбай, агароджа жалезная зварная; тэхнічны стан аб'екта здавальняючы.

**Біяграфія:** паводле сямейнай легенды, Шацукевічы выхадцы з Італіі, сапраўднае прозвішча Шацукіні; Ануфрый Вікенцьевіч Шацукевіч (1836–1899) – найстарэйшы прадстаўнік роду, архітэктар, прымаў удзел у праектаванні і будаўніцтве Свята-Пакроўскай царквы, сінагогі ў м. Койданава; заможны мясцовы жыхар, уладальнік зямлі, лясных угоддзяў, 4 жылых дамоў; памёр ад сухотаў.

**Мѣсто упокоенія / Онуфрія / Викентіевича / ШАЦУКЕВИЧА / Ум. 25 Фев. 1899 г. / 63-хъ лѣтъ. / Владиміра Викентьевича / ШАЦУКЕВИЧА / Умер. 15 Окт. 1927 г. 29 лет. / Викентія / Онуфріевича / ШАЦУКЕВИЧА / Умеръ 6 Авг. 1901 г. / 34 летъ. / И сына его / Феодоры / Ивановны / ШАЦУКЕВИЧЪ / Умер. 38 лѣтъ. / Упокой Господи / души усопшихъ / рабъ Твоихъ. / Койд.-въ Куликовскій**

**Апісанне і стан аб'екта:** граніт, цэгла; 175x80x40 см; сямейна-радавы склеп; стэла з паліраванага ружовага граніту на двухскладовым паліраваным ружовым гранітным прамавугольным пастаменце, адбіты вялікі паліраваны ружовы гранітны шасціканцовы крыж зверху, тэхніка ўрэзкі надпісу мастацкая па выкананні, нанесены па чатырох баках надмагільнага каменя, камера склепа выкладзена цэглай; тэхнічны стан аб'екта нездавальняючы, склеп не захаваўся, агароджа адсутнічае [1–2].

Стары Койданаўскі некропаль – збор артэфактаў мінуўшчыны, своеасаблівы архіў-музей пад адкрытым небам, важны аб'ект даследаванняў у гісторыка-культурным, канфесійным, статыстычна-дэмаграфічным, генеалагічным, анамастычна-моўным і медыцынскім аспектах мікрагісторыі горада. Першапачатковыя вынікі нашай працы – падмурак для правядзення далейшых паўнавартасных прасапаграфічных даследаванняў.

На працягу 2014–2015 гг. некропаль неаднаразова трапляў у поле зроку СМІ, што паспрыяла выхаду праблемы яго існавання на рэспубліканскі ўзровень, намаганням і мерапрыемствам па яго захаванні [3, 9–12].

Але праект добраўпарадкавання, па замове мясцовай улады распрацаваны архітэктарамі Мінскага гарадскога інстытута добраўпарадкавання і гарадскога дызайну ў 2014 г. і прадстаўлены на абмеркаванне гараджанам у 2015 г. [2], па розных прычынах не быў рэалізаваны і не стаў першым крокам па наданні аб'екту мясцовага статуса «Гісторыка-мемарыяльны некропаль горада Дзяржынска».

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Асабісты архіў А.Л. Бараноўскага. Матэрыялы палявых даследаванняў некропаляў Беларусі.– Дзяржынск, Мінск, 2011–2023 гг.
2. Бараноўскі А.Л. Грамадзянскія могілкі па вул. 2-я Ленінская г. Дзяржынска Мінскай вобласці: гістарычная даведка // Объект 15.07 / Реконструкция закрытого кладбища по ул. Протасова в г. Дзержинске. Минск, 2015. [11] с.: іл., фат., 3 карт.
3. На месте кладбища – мемориал: к сведению населения // Узвышша (Дзяржынск). 2014. 24 вер. (№70). С. 3.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Фонд 136.– 1. Спр. 16720. Дело о расширении кладбищ Минского уезда Койдановской Покровской церкви (26.08.1842–07.11.1856).
5. НГАБ. Фонд 136.– Воп. 1.– Спр. 41032. Ч. 3. Спр. 41041. Ч. 3. Спр. 41055. Ч. 3. Спр. 41110. Ч. 3. Спр. 41118. Ч. 3. Спр. 41127. Ч. 3. Спр. 41134. Ч. 3. Спр. 41145. Ч. 3. Спр. 41154. Ч. 3. Воп. 13. Спр. 374–379. Спр. 382–384. Спр. 386–390. Спр. 392–393. Спр. 393а. Спр. 3936. Воп. 14. Спр. 337. Т. 1. Спр. 338–341. Спр. 1387. Спр. 1389. Спр. 1391а. Воп. 34. Спр. 273. Ч. 3. Спр. 274. Ч. 3.
6. НГАБ. Фонд 781.– Воп. 1.– Спр. 3. Ч. 3.
7. НГАБ. Фонд 937.– Воп. 4.– Спр. 93. Ч. 3. Спр. 95. Ч. 3. Спр. 141. Ч. 3. Воп. 8. Спр. 21. Ч. 3. Спр. 22. Ч. 3.
8. НГАБ. Фонд 1781.– Воп. 27.– Спр. 201. Ч. 3. Воп. 30. Спр. 231. Ч. 3.
9. Решение «О закрытии кладбища» // Узвышша (Дзяржынск). 2014. №78. С. 4.
10. І. Свірын. Добраўпарадкаванне альбо… тарнада? Які лёс чакае стaрадаўнія могілкі ў Дзяржынску? // Культура. 2015. №12. С. 1–3.
11. Дз. Серадзюк. Добраўпарадкаваць нельга знішчыць: старажытныя могілкі ў цэнтры Дзяржынска – пад пагрозай знікнення // Звязда. 2014. №208. С. 13.
12. Старое кладбище в Дзержинске: работы по его реконструкции и благоустройству продолжатся в апреле // Рэкламны Дзяржынск. 2015. №15–16. С. 13.